Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 ЛІПЕНЯ 2018 г. СЕРАДА № 125 (28741)



## НАШ ГАЛОЎНЫ ЗДАБЫТАК

**Дарагія суайчыннікі!**

*Віншую вас з Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.*

*Гэта свята, якое аб'ядноўвае лёсы розных пакаленняў, нагадвае пра доўгі і няпросты шлях станаўлення нашай дзяржавы.*

*Мы ведаем цану сапраўднай свабоды. Усведамляем сілу адзінства народа, яго патрыятызму і веры ў будучыню. Разумеем, што суверэнітэт — гэта наш галоўны здабытак.*

*Вызваляючы Радзіму ад гітлераўскіх нацыстаў, адраджаючы краіну ў пасляваенныя гады, ствараючы маладую дзяржаву на разломе эпох і тысячагоддзяў, мы разам пішам гісторыю незалежнай Беларусі.*

*Наш свяшчэнны абавязак — захоўваць памяць пра Вялікі Подзвіг, перадаваць яе будучым пакаленням, берагчы і ўмацоўваць мір на сваёй зямлі, стваральнай працай рабіць яе багацейшай і прыгажэйшай.*

*Няхай гэты знамянальны дзень, які стаў сімвалам мужнасці і гераізму беларускага народа, натхняе нас на новыя дасягненні.*

*Шчыра жадаю вам шчасця, дабрабыту і поспехаў ва ўсіх пачынаннях.*

*З Днём Рэспублікі!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# Мы выбіраем Беларусь

## КРАІНА АДЗНАЧЫЛА СВАЁ ГАЛОЎНАЕ СВЯТА

НЯХАЙ неба дажджлівае, пахмурнае, шэрае, але галоўнае — мірнае. Кожны наш суайчыннік, які перажыў жахі Вялікай Айчыннай вайны, скажа, што няма большай каштоўнасці, чым гэта — мірнае неба над галавой. Ды і мы, маладыя, не можам не пагадзіцца. Такая памяць, перададзеная праз пакаленні, вучыць цаніць мір, спакой, магчымасць развівацца ў дзяржаве, якая не ўступае ў міжнародныя канфлікты, а, наадварот, выступае пляцоўкай для мірных перагавораў. Дзяржаве, у Дзень Незалежнасці якой мы згадваем подзвіг нашых дзядоў і прадзедаў, дзякуючы якому зараз ёсць магчымасць зрабіць глыбокі ўдых і адчуць радасць, што жывы, што яшчэ ўсё наперадзе... Учора ў сталіцы адбыўся ваенны парад, а напярэдадні прайшоў урачысты сход, прымеркаваны да галоўнага свята краіны. СТАР. 2



Фота БелТА.

## Выступленне Прэзідэнта Беларусі А. Р. Лукашэнкі на парадзе ў азнаменаванне Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дня Рэспублікі)

**Таварышы салдаты, сяржанты, прапаршчыкі і афіцэры!**
**Дарагія ветэраны!**
**Паважаныя суайчыннікі і госці!**

Сёння наша краіна адзначае галоўнае дзяржаўнае свята — Дзень Незалежнасці. Гэты дзень па праве заняў асаблівае месца ў гісторыі Беларусі. У ім разам зліліся свяшчэнныя для кожнага з нас паняцці — Свабода і Незалежнасць.

Семдзесят чатыры гады таму ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў была вызвалена сталіца Беларусі — горад Мінск.

У барацьбе з бязлітасным агрэсарам нашы суайчыннікі прадэманстравалі нязломную волю, цвёрдасць і сілу духу. Беларусы не пакарыліся фашысцкім акупантам і разам з іншымі брацкімі народамі перамаглі ў самай страшнай і крывавай вайне дваццатага стагоддзя.

У суровы час ваеннага ліхалецця пацвердзілася ісціна аб тым, што нацыю, якая ўступіла ў смяротную схватку з ворагам за родную зямлю, нельга перамагчы.

Усё далей аддаляюцца ад нас падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Усё менш становіцца відавочцаў таго страшнага выпрабавання. Але мы ніколі не здрадзім тым ідэалам, дзеля якіх змагаліся на франтах і ў тыле ворага гераічныя абаронцы нашай Радзімы.

На жаль, сёння на планеце па-ранейшаму неспакойна. У ваенных канфліктах, у час тэрарыстычных актаў гінуць ні ў чым не вінаватыя людзі.

Да гэтага часу не ўдалося аднавіць сусветны баланс, які быў парушаны ў канцы мінулага стагоддзя.

У гэтых умовах Беларусь актыўна выступае з ініцыятывай маштабнага міжнароднага дыялогу, накіраванага на ўмацаванне архітэктуры міжнароднай бяспекі. І гэта ініцыятыва заслужыла высокую ацэнку.

Сваю міралюбівую палітыку мы дэманструем у адносінах з усімі краінамі. Умацоўваем Саюзную дзяржаву з брацкай Расіяй. Пашыраем супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай — нашым стратэгічным партнёрам. На прынцыпах узаемнай павагі ажыццяўляем дыялог з краінамі Захаду.

Пры гэтым наша гістарычная памяць сведчыць: мірнае неба і стваральная праца павінны быць надзейна абаронены. Расслабляцца нельга!

Таму мы прымаем самыя рашучыя меры па ўмацаванні ваеннай бяспекі.

Важкі ўклад у падтрыманне высокай абараназдольнасці краіны ўносяць Узброеныя Сілы. Яны прыведзены ў адпаведнасць з новымі выклікамі і пагрозамі XXI стагоддзя.

На належным узроўні падтрымліваецца боегатоўнасць рэгіянальнай групоўкі войскаў. Рэалізуецца паслядоўнае ўмацаванне Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Кожны беларус можа быць упэўнены ў гатоўнасці нашай дзяржавы адстаяць нашы суверэнітэт і незалежнасць.

Дарагія сябры!

У бягучым годзе мы пашырылі фармат нашага парада. Ва ўрачыстым мерапрыемстве прымаюць удзел ваеннаслужачыя ўзброеных сіл не толькі Расійскай Федэрацыі, што стала ўжо добрай традыцыяй, але і ўпершыню — Кітайскай Народнай Рэспублікі.

Аддаючы даніну памяці падзеям Другой сусветнай вайны, мы помнім, што яна пачалася на Захадзе і скончылася далёка на Усходзе. Вельмі сімвалічна, што сёння нашчадкі салдат-пераможцаў стаяць у адзіным парадным страі.

Паважаныя ветэраны!

Выказваю вам асаблівую шчырую ўдзячнасць.

Выканаўшы свой абавязак, вы разграмілі агрэсара, адстаялі для нас права жыць у свабоднай краіне. Вашы гераізм і самаадданасць заўсёды будуць служыць прыкладам для цяперашніх і будучых пакаленняў беларусаў.

Зямны вам паклон!

Сённяшняе свята — сімвал мужнасці і стойкасці беларускага народа, пераемнасці пакаленняў і вернасці абавязку.

Яно служыць напамінам аб тым, што лёс Радзімы, яе сучаснае і будучае залежаць перш за ўсё ад нашай вернасці ідэалам свабоды і незалежнасці, імкнення захаваць мір і спакой на роднай зямлі.

У гэты знамянальны дзень жадаю ўсім дабра і дабрабыту.

Слава беларускаму народу, які адстаяў незалежнасць краіны!

Вечная слава героям Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай вайны!

Пашана і слава абаронцам Радзімы!

Са святам вас!

З Днём Незалежнасці!

Ура!

ISSN 1990 - 763X

18125

9 771990 763008

# Мы выбіраем





*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

«Незалежнасць нашай краіне далася дорага, і за яе беларусы ўжо даўно пераплацілі. Таму мы будзем рабіць усё магчымае, каб захаваць мір не толькі на сваёй зямлі, але і перасцерагчы жыхароў планеты ад паўтарэння страшных урокаў гісторыі, — запэўніў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падчас урачыстага сходу да Дня Незалежнасці. — Усведамляючы сябе неад'емнай часткай Еўропы і постсавецкай прасторы, мы працягваем руку дружбы і супрацоўніцтва ўсім. Беларусь не будзе выбіраць паміж Захадам і Усходам. Наш народ выбірае незалежнасць, мір і партнёрства. Мы выбіраем Беларусь».

Сёння для ўсяго беларускага народа Дзень Незалежнасці — гэта сімвал свабоднага і мірнага жыцця. Беларусы былі адзіныя ў сваім выбары і разам больш за два дзясяткі гадоў таму вызначылі 3 ліпеня — дату вызвалення горада-героя Мінска — галоўным дзяржаўным святам, падкрэсліў Прэзідэнт. У гады Вялікай Айчыннай вайны, у далёкім сорак чацвёртым, бітва за сталіцу нашай Радзімы стала вырашальнай у лёсе народа.

## Нашы продкі змаглі, і мы зможам

Продкі беларусаў імкнуліся жыць у дружбе з суседзямі і не імкнуліся захапіць чужое, аднак тэрыторыя нашай краіны стагоддзямі станавілася арэнай ваенных дзеянняў. «У жыцці розных пакаленняў ёсць яркія і натхняльныя прыклады. Ёсць і такія, якія цяжка зразумець і вельмі складана растлумачыць. Але, пэўна, нельга забыць. Гэта — наша мінулае, да ўрокаў якога трэба вяртацца, каб не страціць будучыню. Асабліва, калі гэта мінулае стала для нас сумным вопытам. І абавязкова, калі яно гераічнае», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Таму асабліва важна не сказіць, захаваць для нашчадкаў кожны факт з мінуўшчыны. Таму, звяртаючыся да стагоддзяў мінулых, згадваем, якім доўгім і цяжкім быў шлях да атрымання нацыянальнай дзяржаўнасці. Як няпроста беларусам было зберагчы сваю этнічную самабытнасць. «Але нашы продкі змаглі, і гэта стала першым крокам да незалежнасці», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Менавіта тут, на беларускай зямлі, з'явілася першае перадавое сярэднявечнае права, якое лягло ў аснову канстытуцый многіх



дзяржаў, былі напісаны і надрукаваны першыя падручнікі і грунтоўныя навуковыя працы. «Нямала вядомых палітыкаў і дзяржаўных дзеячаў, военачальнікаў і навукоўцаў — нашы суайчыннікі. Дзясяткі нацыянальных герояў розных краін — выхадцы з Беларусі.

Усе гэтыя факты і людзі, якія ўславілі нашу зямлю, даюць нам права ганарыцца сваім паходжаннем», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Гісторыя беларускай дзяржаўнасці звязана з савецкім перыядам. Амаль стагоддзе таму з нараджэннем БССР Беларусь здабыла законны палітычны і юрыдычны статус. Тады ў краіны з'явілася дзяржаўная сімволіка, былі адкрыты вышэйшыя навучальныя ўстановы, загучала родная мова. «На картах свету былі пазначаны першыя тэрытарыяльныя межы беларускай рэспублікі, якія ледзь не сцерлі з твару зямлі гітлераўскія акупанты», — сказаў беларускі лідар.

## Разам з братамі

У гады Вялікай Айчыннай вайны не толькі самастойнасць і суверэнітэт дзяржавы, але і само права беларускага народа на існаванне было пастаўлена пад пагрозу. І калі зірнуць без ілюзій на падзеі тых гадоў, славяне былі асуджаныя на знішчэнне, як і іншыя народы Савецкага Саюза. «Менавіта таму плячо ў плячо яны змагаліся з фашызмам да апошняга ўздыху. За сваю зямлю і свой род аддавалі жыццё. Простыя і зразумелыя лозунг «За Радзіму» ўздымаў з акопаў, вёў у бой мужчын, жанчын і нават дзяцей. Нашы продкі не проста выжылі. У саюзе з іншымі народамі перамаглі, паказалі прыклад зруйнавальнай сілы адзінства і згуртаванасці нацый. Здзейснілі Вялікі Подзвіг і працягвалі яго здзяйсняць у цяжкі пасляваенны перыяд», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Беларусь уздымалі з руін і попелу людзі, якія прыехалі да нас жыць і працаваць з самых розных куткоў Савецкага Саюза. Многія з іх стварылі ў Беларусі сем'і, пабудавалі дамы, знайшлі тут другую Радзіму,ураслі ў гэтую зямлю каранямі новага радавога дрэва пасляваеннага пакалення. Усё гэта звязала крэўнымі вузамі наш народ з народамі СССР. Менавіта таму словазлучэнне «брацкія народы» для беларусаў — не пусты гук. «Гэта славянскае адзінства ніколі і нікому не ўдасца разарваць і перамагчы!» — заявіў Прэзідэнт.

## Пераможцы былымі не бываюць

У гераічным мінулым нашых дзядоў і прадзедаў праявіліся воля, мужнасць, смеласць і сапраўдны патрыятызм беларускага народа. Таму, памятаючы, чые мы спадчыннікі, усведамляем і памятаем, хто мы. Разумеем, якія сілы і магчымасці закладзены ў наш генетычны код. Таму абавязаны захаваць родную зямлю мірнай і свабоднай. Кіраўнік дзяржавы перакананы, што ўнутраны духоўны патэнцыял народа Беларусі велізарны. Гэта ён дапамог беларусам і ў сучаснай гісторыі, калі без войнаў і кровапраліцця была створана незалежная дзяржава, нягледзячы на цяжкія наступствы пераломнага перыяду.

«Мы паднялі эканоміку пасля перабудовачага заняпаду, прайшлі выпрабаванні сусветнымі крызісамі, загартаваліся і пераканаліся ў правільным выбары галоўных прынцыпаў беларускай дзяржавы — сумленнасці, справядлівасці, роўнасці правоў і магчымасцяў. Наша гісторыя яшчэ раз пацвердзіла, што пераможцы былымі не бываюць. Трэба толькі памятаць пра гэта і верыць у сябе. Наша незалежнасць — перш за ўсё ў свядомасці кожнага», — перакананы Аляксандр Лукашэнка.

Беларусь сёння — гэта ўсе тыя, хто стварае сучасную гісторыю краіны. Народ, які заўсёды жыў у міжнацыянальнай і міжканфесійнай згодзе. Не толькі захаваў самабытнасць, гісторыю і культуру продкаў, але і сфарміраваўся як этнас. Куды б ні цягнуліся нашы родавыя карані, якую б веру ні вызнавалі, мы — дзеці беларускай зямлі. Мы можам па-рознаму ацэньваць вопыт мінулага, але глядзім у адным кірунку, разам ствараючы сваю будучыню. Гэта адзінства дапамагае падтрымліваць







# Беларусь







бяспека, якая застаецца вырашальным аргументам супраць любога ўмяшання ва ўнутраны ўклад жыцця краіны. «І пакуль мы разам, мы з'яўляемся сапраўднымі гаспадарамі сваёй зямлі», — адзначыў беларускі лідар.

## Ніводнага канфлікту за спінай

Беларусь за чвэрць стагоддзя карэнным чынам змяніла сваё становішча ў свеце, і сёння наш голас гучыць на міжнародных пляцоўках, наша краіна стала правадніком бяспекі і стабільнасці ў цэнтры Еўропы. Мы не стварылі ні аднаго ўзброенага інцыдэнту, не справакавалі ніводнага міжнароднага супрацьстаяння. «І ў гэтым наша палітыка застанецца нязменнай», — запэўніў Прэзідэнт.

Пры гэтым кірунак для дзяржавы застаецца тым жа: Беларусь — дзяржава для народа. Усё, што мы стварылі, ствараем і будзем увасабляць у жыццё, служыць гэтай мэце, перакананы Аляксандр Лукашэнка. У нашай краіны няма дасягненняў: мы не толькі гарантавалі харчовую бяспеку, але і сталі ў адзін шэраг з сусветнымі экспарцёрамі сельгаспрадукцыі. Удалося захаваць флагманы беларускай прамысловасці і стварыць новыя. «Будуем АЭС, гарантуючы энергетычную бяспеку краіны. Ушчыльную наблізіліся да лічбавай трансфармацыі эканомікі, разумеючы, што ў сучасным свеце інакш немагчыма», — дадаў беларускі лідар.

«Нам трэба будзе яшчэ шмат зрабіць у сферы абароны свайго інфармацыйнага поля. Гэта адна з найважнейшых умоў унутранай стабільнасці, а значыць, і незалежнасці, — сказаў ён. — Свет «без межаў», але часам і без маральных прынцыпаў шмат у чым фарміруюць сёння папулярныя крыніцы навін — інтэрнэт, сацыяльныя сеткі, месенджары і іншае. Людзі, якія заблудзілі ў Сусветным павуцінні, якія дазволілі маніпуляваць сваёй свядомасцю, перастаюць быць свабоднымі».

Па словах кіраўніка дзяржавы, на прыкладах асобных краін можна ўбачыць, як дэмантаж дзяржаў пачынаецца з хаосу ў галовах грамадзян, з ігнаравання закону, з адмовы ад агульначалавечых нормаў жыцця. «Сфабрыкаваныя навіны, ілжывыя арыенціры сталі галоўнай і дзейснай зброяй сучаснасці. Што мы гатовыя супрацьпаставіць гэтаму? У першую чаргу — свае каштоўнасці, сваю праўду, гісторыю свайго народа, вопыт і мудрасць, якія мы здабылі за час развіцця і станаўлення беларускай дзяржаўнасці», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## Самы важны дзень

Нягледзячы на надвор'е, настрой у людзей у гэтыя дні прыўзняты. Мы пацікавіліся ў жыхароў і гасцей сталіцы, што для іх значыць Дзень Незалежнасці.

У свята Незалежнасці нашай краіны памяць і пашана — ветэранам Вялікай Айчыннай. У Яніны Бычэнкі бацька прайшоў усю вайну і дайшоў Кёнігсберга (сучасны Калінінград), а яна нарадзілася ўжо ў пасляваенны час, у 1949 годзе. «Памятаю, як па хлеб хадзілі за 5-6 кіламетраў, стаялі суткамі ў чарзе... Адна булка на дзень — на ўсю сям'ю, у якой шасцёра дзяцей», — расказвае яна. І пра выпрабаванні тых гадоў, і пра расказы бацькі стараецца лішні раз не ўспамінаць, затое па-асабліваму цэніць свята 3 ліпеня. «Гэта не толькі для мяне, але і для ўсёй краіны — важны дзень. Вядома, такую вайну перажыць!» — дзеліцца жанчына. На яе думку, самае лепшае, што мы можам зараз зрабіць для краіны, — аддавацца сваёй справе. Сама Яніна Бычэнка — ветэран працы, больш за 40 гадоў працавала спачатку ў праектным інстытуце, пасля і на прыватным прадпрыемстве, заraз на заслужаным адпачынку.

А для Уладзіміра Уракопула, які ўсё працоўнае жыццё аддаў ваеннай службе, 3 ліпеня — двайное свята. Учора яму споўнілася 83 гады. «Так што ў мяне ўдвая больш нагод для святкавання, — усміхаецца ён. — Увогуле, ведаеце, чым наша пакаленне адрозніваецца ад сучаснага? Мы ў маладосці перш за ўсё думалі пра Радзіму, а ўжо пасля пра сябе. Таму і перамаглі ў Вялікую Айчынную. Па гэтым прынцыпе я служыў і жыў. Хочацца, каб яго пераняла і наша сённяшняя моладзь», — спадзяецца ён. Хоць сам Уладзімір Мікалаевіч нарадзіўся не ў Беларусі, а ў Расіі, для яго наша краіна стала блізкая не толькі геаграфічна, але і па духу, прызнаецца ён.

Са святам павіншаваў краіну і старшыня савета Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў генерал-маёр Аляксей Адоньеў: «Я, як і ўсе ветэраны, сустракаю Дзень Незалежнасці з душэўным уздымам. Ішоў на свята, глядзеў вакол і думаў: як расквітнела наша краіна, якая прыгожая наша сталіца. Сапраўднае свята! Хочацца ўсім — і кіраўніцтву дзяржавы, і дарагім маім суайчыннікам — пажадаць здароўя, шчасця, поспехаў. А ветэранам — моцнага здароўя. Вялікая ім падзяка за той уклад, які яны ўнеслі і ў Перамогу, і ў тое, што Беларусь стала незалежнай краінай».

* * *

У парадзе, які адбыўся ўчора каля стэлы «Мінск — горад-герой», былі задзейнічаны больш за 4 тысячы вайскоўцаў і 250 адзінак баявой тэхнікі, было прадстаўлена 19 пешых і 23 механізаваныя парадныя разлікі. Упершыню ў парадным страі прайшлі жанчыны-вайскоўцы злучэнняў і воінскіх часцей беларускай арміі і зводны разлік кадэцкіх вучылішчаў, спецыялізаваных ліцэяў і кадэцкіх карпусоў, разлік ваеннаслужачых Народна-вызваленчай арміі Кітая. Традыцыйна ў парадзе прынялі ўдзел вайскоўцы з Расіі.

Адразу пасля парада гледачы ўбачылі масавае тэатралізаванае прадстаўленне «Мой родны кут». У яго фінале плошчу запоўнілі дзеці ў адзенні з назвамі ўсіх гарадоў і пасёлкаў гарадскога тыпу Беларусі як увасабленне будучыні малой радзімы. У неба выпусцілі тысячу паветраных шароў у форме сэрца ў колерах дзяржаўнага сцяга, адначасова ў паветра падняўся аэрастат у форме сэрца з надпісам «Мая Радзіма».

Завяршыў святочную праграму 3 ліпеня гала-канцэрт на плошчы каля стэлы «Мінск — горад-герой», кульмінацыяй якога сталі акцыя «Праспяваем гімн разам» і святочны салют.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**







# КВІТНЕЙ, МАЯ РАДЗІМА!

**Ва ўсіх раёнах краіны прайшлі святочныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня Незалежнасці**



Фота БелТА.

Брэстчына:

## Патрыятычны цэнтр і народныя гулянні

**У Брэсце Дзень Незалежнасці пачаўся з ускладання кветак на плошчы Свабоды і ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой».**

Вянкі і кветкі ад кіраўніцтва горада і вобласці, ветэранаў, грамадскасці па традыцыі леглі да Вечнага агню, запаленага ў гонар абаронцаў крэпасці. Затым усе прысутныя накіраваліся да будынка былога штаба 125-га стралковага палка, а цяпер маладзёжнага патрыятычнага цэнтра. Яго рэстаўрацыя вялася на працягу некалькіх апошніх гадоў. Аб'ект будавалі грамадой. На яго стварэнне БРСМ накіраваў прэмію Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне». Таксама пералічваліся сродкі, якія жыхары Брэстчыны зарабілі на суботніку.

І вось патрыятычны цэнтр на Кобрынскім умацаванні Брэсцкай крэпасці прыняў першых наведвальнікаў. Ён працуе як установа дадатковай адукацыі. Тут арганізоўваюць клубы па інтарэсах, заняткі ваенна-прыкладнымі відамі спорту, па дапрызыўнай падрыхтоўцы. Цэнтр аб'ядноўвае краязнаўцаў, пошукавікаў і гістарычных рэканструктараў.

Павіншаваць гаспадароў новага аб'екта з адкрыццём прыйшоў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС.** Губернатар падкрэсліў, што падобны аб'ект адзіны ў краіне, і пажадаў яго гаспадарам плённай работы на карысць патрыятычнага выхавання моладзі.

Далей святочныя мерапрыемствы ў Брэсце перамясціліся ў парк культуры і адпачынку, у парк Воінаў-інтэрнацыяналістаў, а таксама на плошчу Леніна, дзе адбыўся святочны канцэрт.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Магілёўшчына:

## Ад свята горада да свята краіны

Усе дні запар, пачынаючы з 28 чэрвеня — дня нараджэння горада, — Магілёў жыў канцэртамі, выстаўкамі, дыскатэкамі, фестывалямі, кінапаказамі, быццам рыхтуючыся да галоўнага свята рэспублікі — Дня Незалежнасці.

Святкаванне Дня Незалежнасці ў Магілёве пачалося з урачыстага мітынгу на сімвалічным для Магілёва месцы — Буйніцкім полі. Затым святочныя мерапрыемствы перамясціліся на шматлікія пляцоўкі горада, запаўняючы сабой вуліцы, скверы, плошчы.

У гэты ж дзень у Слаўгарадскім раёне адбылося перапахаванне васьмі байцоў Чырвонай арміі, астанкі якіх былі знойдзены падчас нядаўніх пошукавых работ.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Віцебшчына:

## Сустрэчы каля Кургана Дружбы і ўшанаванне памяці

Напярэдадні Дня Незалежнасці 59 раз на стыку межаў Беларусі (Верхнядзвінскі раён), Латвіі і Расіі 1 ліпеня сустрэліся жыхары гэтых краін каля Кургана Дружбы. Ён быў створаны ў 1959 годзе, каб увекавечыць баявое сяброўства партызан. І што вельмі сімвалічна, у ганаровай абстаноўцы быў адкрыты таксама менавіта 3 ліпеня. Таму да гэтай акцыі ў жыхароў Прыдзвіння напярэдадні Дня Незалежнасці асаблівае стаўленне. У святкаванні па традыцыі ўзялі ўдзел кіраўнікі ўлады Віцебшчыны. У прыватнасці, губернатар Мікалай Шарснёў, старшыня абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў. Тут таксама пабываў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Аляксандр Субоцін. З расійскага боку быў часова выконваючы абавязкі губернатара Пскоўшчыны Міхаіл Вядзернікаў. А з Латвіі прыехаў дэпутат парламента Артур Рубікс.

На галоўнай плошчы Віцебска — Перамогі — у Дзень Незалежнасці адбылося ўскладанне вянкоў і кветак да мемарыяльнага комплексу ў гонар савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў, пасля якога адбыўся ўрачысты мітынг. Віншуючы на ім землякоў, старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў адзначыў:

— Імкненне нашага народа быць самастойным — гэта стрыжань, які мацуе нацыю.

Ён расказаў, што на сродкі, заробленыя на суботніках, у Расонскім раёне пасля рэканструкцыі адкрыты мемарыяльны комплекс — на месцы, дзе пахаваны 2,5 тысячы воінаў, партызан, падпольшчыкаў. У найбліжэйшы час будуць рэканструяваць комплекс у Дубровенскім раёне, дзе каля 10 тысяч савецкіх воінаў здабылі вечны спакой.

Пасля мітынгу адбыўся святочны парад-шэсце з удзелам абаронцаў Айчыны, ваеннага духавога аркестра, прадстаўнікоў працоўных калектываў, грамадскасці.

Па добрай традыцыі пасля гэтага кіраўнікі мясцовай улады ўсклалі кветкі да бюста славутага земляка, Героя Савецкага Саюза, Героя Сацыялістычнай Працы П. М. Машэрава.

Увечары тысячы гараджан і гасцей горада прыйшлі на святочны канцэрт».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Міншчына:

## Спартыўныя спаборніцтвы, канцэрты і выстаўкі

**Афіцыйная цырымонія ўшанавання памяці загінулых у Вялікай Айчыннай вайне па традыцыі пачалася з Кургана Славы. Да падножжа абеліска кветкі ўсклалі старшыня Мінаблвыканкама Анатоль Ісачанка, дэлегацыі Барысаўскага, Лагойскага, Смалявіцкага раёнаў і горада Жодзіна. Прадстаўнікі Мінаблвыканкама наведалі таксама мемарыяльныя комплексы «Хатынь» і «Дальва».**

Вечарам у гэты ж дзень кіраўнік сталічнага рэгіёна, а таксама памочнік Прэзідэнта Беларусі — інспектар па Мінскай вобласці Ігар Яўсееў, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Якубіцкая прыехалі ў Маладзечна, дзе ў мясцовым амфітэатры разам з гасцямі, жыхарамі горада паглядзелі святочны канцэрт у гонар Дня Незалежнасці з удзелам Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл.

Падчас святкавання адбылося шмат відовішчных мерапрыемстваў, спартыўных спаборніцтваў, канцэртаў, выступленняў народных аматарскіх калектываў.

Акрамя традыцыйных мерапрыемстваў адбылося шмат новых. Напрыклад, у Бярэзінскай ЦРБ прадставілі праект «Музей у чамадане». У Вілейцы ўсе ахвотныя змаглі пазнаёміцца з выстаўкай работ Уладзіміра Слабодчыкава. У Маладзечне тым часам экспанаваліся творчыя работы ўдзельнікаў адкрытага пленэра мастакоў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Гомельшчына:

## Дзень вышыванкі і дэфіле

**Святочнае шэсце ветэранаў, урачысты мітынг, ускладанне кветак да брацкай магілы савецкіх воінаў... Гэтыя традыцыйныя моманты — абавязковыя ў праграме свята да Дня Незалежнасці Беларусі ў Гомелі.**

Дарэчы, можна было паглядзець выстаўкі-прэзентацыі ўстаноў культуры, адукацыі і прадпрыемстваў горада над Сожам. Канцэртныя праграмы прапанавалі выступленні гуртоў Kawa, Skynet і Лепрыконсы. А на стадыёне «Цэнтральны» запрошаныя атрымалі ўражанні ад спеваў заслужанай артысткі Расіі Крысціны Арбакайтэ.

Сем жыхароў Гомельшчыны напярэдадні атрымалі ганаровае званне «Чалавек года». Лаўрэатаў 2017 года ўшанавалі на ўрачыстым сходзе.

Ва ўсіх раёнах Гомельшчыны прайшоў Дзень вышыванкі. Маладыя людзі выбіралі тых, у каго самы лепшы строй з элементамі народнай вышыўкі. У Буда-Кашалёўскім раёне кожнаму ўдзельніку падаравалі бранзалет з элементамі патаемных знакаў народнай культуры. У Рагачоўскім быў арганізаваны майстар-клас Hand-made і выстаўка мясцовых майстроў-рамеснікаў. У Калінкавіцкім прайшло сямейнае свята «Тата, мама, я — маёй краіны дружная сям'я». Актыў БРСМ Кармянскага раёна арганізаваў своеасаблівы флэшмоб «Я ведаю і ганаруся!», а гамяльчан запрасілі на тэматычнае дэфіле «Вянок маладосці». Да таго ж актывісты саюза моладзі наведалі кожны радзільны дом і падарылі немаўлятам адзежу з элементамі вышыванкі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**





Гродзеншчына:

## Узнагароды найлепшым, выстаўка рэтратэхнікі і дарога

У Гродне святочныя мерапрыемствы пачаліся на Кургане Славы. Тут сабралася каля тысячы гараджан і гасцей горада, каб прыняць удзел у свяце і паназіраць за парадам ваеннай тэхнікі і войскаў Гродзенскага гарнізона. Аркестр сілавых структур прадэманстраваў плац-канцэрт і дэфіле.

Падчас урачыстых мерапрыемстваў былі адзначаны найлепшыя працаўнікі. Лаўрэатамі прэміі «Чалавек года Гродзеншчыны» сталі 19 прадстаўнікоў розных галін эканомікі — прамысловасці, сацыяльнай сферы, спорту, сельскай гаспадаркі, ЖКГ.

Пасля мітынгу пляцоўкай авалодалі народныя і эстрадныя калектывы. На Кургане Славы выступілі ансамбль беларускай песні «Гасцінец», эстрадная студыя «Забава», гурт NaviBand, віртуоз-балалаечнік Аляксандр Варанішча.

У цэнтры Гродна свята адбывалася на некалькіх пляцоўках. Наведвальнікі «Арт-кафэ» пад адкрытым небам мелі магчымасць пазнаёміцца з творчасцю шматлікіх гродзенскіх калектываў.

На пляцоўках у Швейцарскай даліне працавалі фотазоны і былі арганізаваны спартыўныя спаборніцтвы. Каля маладзёжнага цэнтра «Гродна» выступілі маладзёжныя поп- і рок-гурты. Упершыню адбыўся канцэрт класічнай музыкі пры ратондзе на глядзельнай пляцоўцы каля Нёмана. На плошчы Савецкай арганізавалі вялікую выстаўку рэтратэхнікі, дзе можна было ўбачыць першы прадстаўнічы ГАЗ-12ЗІМ.

Да Дня Незалежнасці прымеркавана і такая падзея, як адкрыццё ў маладым мікраараёне Альшанка ўчастка шасціпалоснай дарогі на ўездзе ў мікрараён.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# КРУГІ НА ВАДЗЕ

## Невядомыя старонкі вядомай вайны

**Быццам ужо і знік кінуты ў возера камень, але нам яшчэ доўга пра яго нагадваюць кругі на вадзе... Столькі гадоў прайшло пасля вайны, але ў памяці сведкаў усё ўсплываюць жудасныя малюнкі. «Забываецца добрае, а дрэннае — голад, катаванні, жах — забыць немагчыма», — заўважаюць былыя вязні. Часам праблемы са здароўем агаляюць старыя раны, і нічога дзіўнага няма ў тым, калі раптам былы вязень Асвенцыма праз столькі дзесяцігоддзяў пасля вайны пачынае хаваць у кішэнях і пад падушкай сырую бульбіну, скарынкі хлеба. Ці бабулі, якую ўжо ногі не трымаюць з-за процьмы хвароб, кожны раз, як яна падае, падаецца, што яе штурхаюць фашысты...**

**Мы яшчэ многа не ведаем пра вайну і ўсё яшчэ працягваем яе адкрываць у тым ліку і праз расказы людзей, якія бачылі яе на ўласныя вочы. Так было і падчас «Шчырых размоў з былымі вязнямі канцлагераў». Маладыя людзі, што прыйшлі на сустрэчу, арганізаваную грамадскім аб'яднаннем «Узаемаразуменне» і цэнтрам «Жывая бібліятэка», змаглі пачуць гісторыі сведкаў, якія ў дзяцінстве трапілі ў самыя жудасныя месцы.**

### «ЗА ШТО, МЫ Ж НІКОГА НЕ ЗАБІВАЛІ?»



Сям'я **Ларысы АЛЕКСАНДРЭНКІ** сустрэла вайну на мяжы. Яе бацька служыў у Брэсцкім пагранатрадзе ў Камянецкім раёне. За паўтара месяца да пачатку Вялікай Айчыннай службоўцы атрымалі прыказ перавезці да сябе сем'і — трэба было паказаць, што ўсё ціха, мірна. Некаторыя жонкі з немаўлятамі на руках прасіліся, каб іх адпусцілі, маўляў, цяжка гадаваць малых без падтрымкі сваякоў, але ім не дазволілі паехаць...

Пасля вайны Ларыса спытае ў маці, што тата казаў у ноч на 22 чэрвеня (калі пачалася Вялікая Айчынная, ёй было толькі тры з паловай гады). Перад тым як пайсці, ён паабяцаў: «Савецкая ўлада вас не пакіне». Больш сям'я яго ўжо не пабачыць... А ў чэрвені 1942 года Ларыса з мамай і старэйшым брацікам апынецца ў яўрэйскім гета ў мястэчку Чарнаўчыцы. Там утрымлівалі каля 300 чалавек неяўрэйскіх нацыянальнасцяў: жанчын, дзяцей, старых. Гэта былі сем'і камандзіраў Чырвонай арміі, партыйных савецкіх работнікаў. Па словах Ларысы Аляксееўны, такіх вязняў называлі «ўсходнікі», «саветкі». Звычайна такіх людзей адразу расстрэльвалі, напрыклад, так было ў Жабінцы. Але і ў Чарнаўчыцах за кратамі ад голаду і хвароб загінулі многія.

— Падышлі падводы, і ў нас забіралі ўсё, — згадвае Ларыса Аляксееўна. — Я памятаю, як мая выхадная дзіцячая сукенка ляціць у агульную кучу, а мама кажа: «Плачце, плачце, можа, хоць што-небудзь пакінуць».

Захаваліся ўспаміны адной з былых вязняў Чарнаўчыц, у якіх жанчына падзялілася, як тады ўспрынялі перасяленне. Калі людзі пабачылі разгромленыя дамы з павыбіванымі вокнамі і дзвярыма (былыя гаспадары — яўрэі, былі знішчаны), дрот і ахову з аўтаматам каля варот, стаяў жудасны плач. Старэйшы брацік Ларысы, якому на той час было шэсць гадоў, закрычаў, заплакаў: «Мамачка, куды ж нас прывезлі? Мы ж нікога не забівалі, не кралі. За што нас садзяць?»

У кожным з такіх дамоў тулілася па некалькі сем'яў.

— У гета мы заставіліся больш за два гады. І хоць я тады была малая, асобныя эпізоды добра памятаю. Пастаянным было пачуццё жаху. Я ўсё чаплялася за маці, імкнулася заўсёды быць з ёй. Зараз дзіўлюся, як нашы мамы гэта вынеслі (дарэчы, там была жанчына і з чатырма малымі). Смяротнасць вялікая, кароста не выводзілася. Памятаю, у дзяцей глісты проста да рота лезлі. На просьбу людзей, што трэба нешта рабіць, бо паміраюць дзеці, паліцаі адказваюць: «Больш памрэ дзяцей, менш камуністаў будзе». Маці казала, што паліцаі тут былі горшыя за немцаў. Яна згадвала, што бачыла, як паліцай прывязаў да веласіпеда яўрэйскую дзяўчынку, хутка ехаў, а тая так бегла за ім, што ў яе пена ішла з рота.

Яўрэяў знішчалі за тэрыторыяй гета. Прыходзілі машыны (так званыя душагубкі), ахвяр раздзявалі, расстрэльвалі, а адзенне і абутак разбірала мясцовае насельніцтва. Ранкам мы заўважалі плямы крыві, а дарослыя часта шапталіся: «Зноў быў расстрэл».

Ларыса добра запомніла дзень, калі іх вызвалілі (28 ліпеня 1944 года). Была чуваць страляніна, зніклі немцы, і толькі паліцаі мітусіліся. Сям'я схавалася ў бур'яне, што вырас пад два метры. Калі ўвайшлі савецкія танкі, радасныя людзі беглі за імі. Ларыса тады нават упала і моцна разбіла локаць...

Тату яна знойдзе толькі ў 2002 годзе, доўгі час яго лічылі зніклым без вестак. Але праз пошукавую службу Чырвонага Крыжа яна даведалася, што бацька пахаваны ў польскім горадзе Гайнаўка ў Польшчы...

### «ДАМОЎ ХАЧУ!»

Шаснаццацігадовая Наташа пакідала горад са знаёмымі. Яе маці працавала ў абласной газеце ў Львове і да апошняга заставалася ў горадзе. Калектыў эвакуяваўся, калі немцы былі ўжо на ўскрайку. Па дамове маці з дачкой павінны былі сустрэцца ў Нікалаеве. Але дзяўчына трапіла ў Адэсу, і адтуль яна вырашае ісці пешшу 140 кіламетраў да Нікалаева.

— Лютыя маразы 41-га года. Я прайшла і адчуваю, што больш не магу. Села і так бы там і замерзла. Але раптам спынілася машына, мяне падабралі немцы, перавезлі цераз мяжу і даставілі да самага дома, — прыгадвае 94-гадовая **Наталля РАДЧАНКА.**

У Нікалаеве дзяўчына трапіла ў аблаву. Яе схапілі на вуліцы, пасадзілі ў таварняк і павезлі ў размеркавальны лагер у Вупертале ў Германіі. Сюды па работнікаў прыходзілі прадстаўнікі розных вытворчасцяў. Дзяўчына спрабавала адтуль збегчы дадому, але ў цягніку яе злавілі і адправілі ў штрафны лагер.

— Я працавала са старэнькім немцам. Аднойчы ён загаварыў: «Марушка (мы ўсе ў яго былі Марушкі), там хлеб табе прынёс», — расказвае жанчына. — Пэўны час ён мяне падкормліваў, а неяк запытаўся,



чым мог бы яшчэ дапамагчы. Зразумела, я адказала: «Дамоў хачу!» Ён мяне вывеў, прывёз адзежу, набыў білеты і даў грошы, каб я пасля перасела ў іншы цягнік. Але мяне затрымалі і накіравалі ў канцэнтрацыйны лагер Равенсбрук, а пасля гэтага ў Ноенгамэ. Працавала на канвееры, галодная была страшэнна. Вечарам нам давалі кавалак хлеба, яго з'ядалі адразу, а з ранку галодныя ішлі на працу. Я сядзела за канвеерам і думала, каб зараз сказалі: «Накормім, а пасля павесім», — пагадзілася б...

### «ДЗЕТКІ, НЕ БОЙЦЕСЯ. МАЦІ ПОБАЧ»

— Неяк я глядзела кіно пра вайну, дзе ў жанчыны забіралі хлопчыка, так рыдала, — дзеліцца **78-гадовая Галіна ЧУГАЕВІЧ.** —



Згадала такі ж эпізод: у палонных жанчын немцы адбіралі дзяцей, а маці ўчапілася за мяне. Яе пачалі біць прыкладамі, жорстка. Яна не аддае, пачалі біць мяне, тады маці на мяне ўпала. І тут нейкі немец пабачыў гэта ў акно, нешта сказаў сваім, і нас пакінулі разам. Мама, відаць, не думала, што нас не раздзеляць, і ўсё паўтарала: «Запомні, ты — Галачка Казлова з Мінска».

У 1943 годзе, калі пачаліся масавыя арышты, падпольшчык Казлоў пераправіў жонку і дзвюх дочак у партызанскі атрад. Але праз некаторы час яго сям'я трапіла пад аблаву.

— Пальба, уздыбленыя коні. Людзі кінуліся ўцякаць. А я малая стаю на падвозе і плачу, маці з сястрой кінуліся да мяне і не змаглі збегчы. Немцы нас, палонных, гналі праз балота, праз гаць. Маці аступілася, і яе стала зацягваць багна. Немец зняў аўтамат, каб яе прыстрэліць. Сястра заплакала, кінулася да яго ў ногі, і ён працягнуў аўтамат і выцягнуў маці... Памятаю невялікі абрыўчык. З аднаго боку маці — я, з другога — сястра, а немцы па нас страляюць. Маці разварочвае нас да сябе і кажа: «Дзеткі, не бойцеся, гэта не страшна, вы ж з мамай». Пасля высветлілася, што гэта фашысты так забаўляліся, пужалі... Ведаеце, там ліку дням не было, быў суцэльны жах, — згадвае Галіна Адамаўна. — Мы аказаліся ў Варшаўскім канцлагеры — філіяле Майданэка. Гэта быў новы лагер знішчэння з печамі... Аднойчы нам сказалі, што паведуць мыцца. Жанчынам, у якіх доўгія валасы, састрыглі косы (нядаўна згадвала, што з валасоў рабілі матрацы. Хто ж на іх спаў?). Загадалі раздзецца. Загналі ў нейкае памяшканне з парасончыкамі, па баках — лаўкі з ацынкаванымі тазамі, і нам сказалі нацерці рукі і ногі вадкасцю з іх. А пасля выгналі праз другія дзверы, пазней высветлілася: перабылталі — спачатку павінны былі знішчыць людзей з іншага барака...

У 1989 годзе для былых вязняў, сярод якіх былі і сёстры Казловы, арганізавалі паездку па месцах катавання. І калі ў музеі ў Майданэку жанчыны зайшлі ў такое памяшканне, пацікавіліся, што ж за рэчыва было ў тазах, падобнае на вадкае мыла, і навошта, калі людзей знішчаюць, трэба было ім націрацца. Аказалася, каб лягчэй катам было разнімаць целы, што сплятаюцца ў агоніі. «Нам паказалі шчыпцы, якімі расцягвалі мёртвых ахвяр. Здаецца, у 1944 годзе не было так страшна», — заўважае Галіна Адамаўна.

### «ЛЕПШ БЫ ЁН ЗАСТАЎСЯ МАСТАКОМ»

Яўген Хрол паказвае сваю мініяцюрную відэакамеру: «Відаць, у дзяцінстве не нагуляўся, вось цяпер балуюся. Мне восемдзесят гадоў, але я яшчэ са сваімі ўнукамі ў футбол гуляю...» На сустрэчы мужчына не толькі расказвае сваю гісторыю, але і паспявае здымаць. Між іншым, дакументальныя фільмы пра вайну, зробленыя Яўгенам Аляксеевічам, добра вядомыя многім. Часта ён паказвае іх на сустрэчах у школах, бо ўпэўнены, што часам рэальны малюнак можа ўразіць больш, чым сухія расказы.

— Я быў вязнем аўстрыйскага канцлагера Маўтгаўзен. Сёння некаторыя людзі спецыяльна накіроўваюць дзяцей за мяжу вывучаць мовы. А мы вывучалі іх у канцлагерах, — расказвае Яўген Хрол. — Уявіце дзяцей 4—6 гадоў у турме. Мы былі біялагічным матэрыялам, у нас бралі кроў... Вы ведаеце, што такое печ, падгнілыя буракі з чарвякамі, лушпай? А мы гэтым харчаваліся... Я выходзіў адтуль — толькі скура ды косці... Часта нас, былых вязняў, запрашаюць выступаць у нямецкіх навучальных установах, і ў тым жа Маўтгаўзене, у школе нават ёсць праграма «Не дай бог, вайна». Я быў у школе, дзе вучыўся Гітлер, бачыў парту, за якой ён сядзеў, я ведаю яго акварэлі (яны нядрэнныя, вартыя ўвагі, з малатка іх прадавалі за вялікія грошы), лепш бы ён застаўся мастаком...

Яўген Хрол можа доўга расказваць не толькі пра малавядомыя факты, звязаныя з канцэнтрацыйным лагерам, — ён меў доступ да архіваў Маўтгаўзена і таксама ў Нацыянальным архіве збіраў інфармацыю пра месцы прымусовага ўтрымання ў Беларусі. Ён звяртае ўвагу, што ў вайну на тэрыторыі нашай сталіцы было дзевяць канцлагераў, у Мінску і Мінскім раёне загінула 400 тысяч чалавек!

— Часам мне задаюць пытанні: «Каму на вайне было горш: людзям у канцлагерах, усходнім рабочым?» Кінуць каменьчык у возера і паглядзіце, якія кругі. Але, калі вы зашпурняце цагліну, усё адно па вадзе пойдуць круглыя хвалі. Вайна — усюды няшчасце, жах.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»**

**Лот № 1.** Изолированное помещение, расположенное на 2-м этаже капитального строения с инв. № 200/С-50901 общей площадью 229,8 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. **Нач. цена:** 39 744 руб. **Задаток:** 3 974,40 руб.

**Лот № 2.** Изолированное помещение, расположенное на 2-м этаже капитального строения с инв. № 200/С-50901 общей площадью 300,5 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. **Нач. цена:** 58 752 руб. **Задаток:** 5 875,20 руб.

**Лот № 3.** Изолированное помещение, расположенное на 1-м этаже капитального строения с инв. № 200/С-50901 общей площадью 291,3 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. **Нач. цена:** 50 976 руб. **Задаток:** 5 097,60 руб.

**Лот № 4.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-86161, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение, площадью 7739,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83. Обременение: ипотека ОАО «Приорбанк». Имущество обращено в доход государства у ООО «ОСТБЕЛИНВЕСТ» (УНП 190136471). **Нач. цена:** 1 071 360 руб. **Задаток:** 107 136 руб.

**Условия:** 1. Участник аукциона, ставший победителем, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен соответствующим Управлением Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, созданного в нем межрайонного отдела, в котором имущество состоит на учете, но не более чем на 20 рабочих дней; возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. 2. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. 3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона www.marketvit.by. Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». При оформлении лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет: копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица, и его паспорт; паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенную доверенность для представителя физического лица; копию платежного документа, подтверждающего внесение в установленном порядке задатка в размере 10 % от начальной цены продажи; организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе; документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на русский или белорусский языки; представителями организаций – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 04.04.2017, 15.07.2017, 28.11.2017, 02.12.2017, 06.01.2018, 18.01.2018, 21.02.2018, 17.03.2018, 20.03.2018, 03.05.2018.

**Повторный аукцион состоится 19.07.2018 в 10.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** в рабочие дни с 04.07.2018 с 8.30 по 18.07.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 7). **Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by**

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

**ЛОТ 1:** изолированное помещение, инв. № 400/D-5569 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение), площадью 165,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Лермонтова, 8

Начальная цена продажи – 52 387,02 р. (пятьдесят две тысячи триста восемьдесят семь рублей две копейки) с учетом НДС. Сумма задатка – 5 238 р. (пять тысяч двести тридцать восемь рублей)

Продавец – Гродненский городской филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 8-0152-52-02-88

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона:
- расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на покупателя;
- право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;
- документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи.

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 19 июля 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

